# СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 33 (127) | Субота 4 лістапада 1972 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.

**Няхай вечна жыве і працвітае непарушная брацкая дружба народаў СССР—вялікая заваёва ленінскай нацыянальнай палітыкі КПСС!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).




Плакат мастака В. Акімава.

## У ПАРТКОМЕ

1 лістапада адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта.

На ім у члены КПСС прыняты Л. В. Немчанка, У. І. Бышык, Т. Я. Шабан, М. І. Кузьменка.

Пра ход падпіскі на перыядычныя выданні далажылі сакратары партыйных арганізацый гісторыка-філалагічнага і геалагічнага факультэтаў.

## ВУЧОНЫ САВЕТ

2 лістапада адбылося пасяджэнне Вучонага савета універсітэта.

Аб выніках летняй вучэбна-экзаменацыйнай сесіі на аддзяленні завочнага навучання і задачах у новым 1972--1973 навучальным годзе далажыла прарэктар па завочнаму навучанню дацэнт Т. П. Трацэўская.

Паведамленне пра выкананне плана павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта зрабіў прарэктар па вучэбнай рабоце дацэнт Д. А. Лявончанка.

Пра арганізацыю службы навукова-тэхнічнай інфармацыі ва універсітэце расказаў начальнік навукова-даследчага сектара М. І. Твардоўскі.

Вучоны савет абраў па конкурсу на вакантныя пасады загадчыкаў кафедр, дацэнтаў, выкладчыкаў і асістэнтаў.

Па ўсіх разгледжаных пытаннях былі прыняты адпаведныя пастановы.

# РАПАРТ

### ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ЧЫГУНАЧНАМУ РАЙКОМУ КП БЕЛАРУСІ І ВЫКАНКОМУ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ ЧЫГУНАЧНАГА РАЁНА ГОРАДА ГОМЕЛЯ Ў ГОНАР 55-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Бягучы год знамянальны ў гісторыі нашай краіны святкаваннем двух слаўных і радасных дат — 55-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і 50-годдзя ўтварэння СССР. Шматнацыянальная і дружная сям'я савецкіх народаў сустракае гэтыя сусветна-гістарычныя святы відавочным уздымам творчай энергіі, працоўнага энтузіязму. Работнікі калгасных і саўгасных палёў, рабочыя заводаў і фабрык рапартуюць Радзіме аб сваіх новых поспехах і здзяйсненнях.

Есць што сказаць Радзіме ў гэтыя перадюбілейныя дні і шматтысячнаму калектыву Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Зараз на сямі факультэтах (гісторыка-філалагічным, эканамічным, фізічным, механіка-матэматычным, біёлага-глебавым, геалагічным і фізічнага выхавання) займаецца каля шасці тысяч студэнтаў. Гэта амаль у два разы больш, чым у пачатку яго біяграфіі, тры гады назад.

Палітыка-выхаваўчую, вучэбна-метадычную і навукова-даследчую работу вядуць 330 высокакваліфікаваных выкладчыкаў, у тым ліку 1 акадэмік АН БССР, 16 дактароў навук, прафесараў, больш 100 кандыдатаў навук і дацэнтаў.

З году ў год павышаецца паспяховасць студэнтаў. Так, у летнюю залікова-экзаменацыйную сесію яна склала 95,5 працэнта, што з'яўляецца адным з лепшых паказчыкаў у рэспубліцы, 252 чалавекі вучацца толькі на выдатна. А ўсяго на выдатна і добра займаюцца 70 працэнтаў студэнтаў.

Паспяхова развіваецца навукова-даследчая работа. Зараз у студэнцкім навуковым таварыстве займаецца звыш 1000 студэнтаў. На рэспубліканскія конкурсы было прадстаўлена 160 навуковых работ. 62 работы ўдастоены дыпломаў, а 4 адзначаны на Усесаюзным конкурсе. 70 нашых студэнтаў удзельнічалі ў навуковых канферэнцыях іншых ВНУ. 50 прыцягнуты да выканання гаспдагаворных тэм. У цяперашні час рыхтуецца 2-я студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР.

З кожным годам павялічваецца колькасць аспірантаў. Калі раней у аспірантуры навучаліся 3—4 чалавекі, то зараз — 50. У гэтым годзе званне прафесара атрымаў доктар філалагічных навук У. В. Анічэнка, паспяхова абаранілі доктарскія дысертацыі дацэнты І. Ф. Харламаў, В. Д. Арэшчанка, тры выкладчыкі — кандыдацкія дысертацыі, падрыхтавана да абароны яшчэ 5.

Вучоныя універсітэта шырока разгарнулі даследаванні актуальных для народнай гаспадаркі і навукі праблем. Сфарміраваліся навуковыя профілі па вывучэнню прамысловага, сельскагаспадарчага і культурнага патэнцыялу беларускага Палесся. Аб'ём гаспдагаворных тэм узрос у параўнанні з мінулым годам у 2,5 раза. Вучоныя апублікавалі дзесяткі артыкулаў у часопісах і навуковых зборніках, а В. Д. Арэшчанка, У. А. Белы, Н. С. Кісялёва, М. В. Навучыцель, Л. А. Нікалаеў, І. Ф. Харламаў выдалі манаграфічныя даследаванні. Значна ўмацаваліся навуковыя сувязі кафедр, лабараторый з прадпрыемствамі і НДІ.

Расце і мацнее матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта. Зараз да паслуг студэнтаў ёсць добра абсталяваныя лабараторыі, аўдыторыі, складаная тэхніка. Хутка вядзецца будаўніцтва новага вучэбна-лабараторнага корпуса і добраўпарадкаванага інтэрната. У недалёкім будучым будзе створан сучасны універсітэцкі гарадок. У гэты велічны ансамбль, распрацаваны ГіпраВНУ СССР, увойдуць шматпавярховыя вучэбныя карпусы, НДІ, вылічальны цэнтр, батанічны сад, музей прыроды Палесся, фундаментальная бібліятэка, выдавецтва, спартыўны комплекс, студэнцкія інтэрнаты.

Вялікая ўвага ва універсітэце ўдзяляецца выхаванню грамадскай актыўнасці студэнтаў. Яны сістэматычна выступаюць з лекцыямі і дакладамі перад насельніцтвам. Толькі па матэрыялах XXIV з'езда КПСС і ператварэнню ў жыццё яго рашэнняў прачытана звыш 400 дакладаў і лекцый. На прадпрыемствах горада, у калгасах і саўгасах вобласці нашы самадзейныя артысты выступілі з дзесяткамі канцэртаў. У трэцім працоўным семестры 500 байцоў у саставе 23 будаўнічых атрадаў на будоўлях вобласці і брацкіх рэспублік асвоілі капіталаўкладанняў на суму звыш 750 тысяч рублёў.

Вялікага поспеху дабіліся нашы студэнты на Усесаюзнай універсіядзе «Харкаў-72». Танцавальны калектыў, вакальна - інструментальны ансамбль «Радзімічы», вакалісты, спартсмены, маладыя даследчыкі сталі лаўрэатамі і дыпламантамі.

Значныя поспехі універсітэта і ў спорце. Мы ганарымся тым, што сярод выхаванцаў ГДУ ёсць чэмпіёны Еўропы, краіны і рэспублікі. Амаль кожны другі наш студэнт —спартсмен-разраднік. Зборныя каманды Гомельскай вобласці і горада на 90 працэнтаў укамплектаваны спартсменамі універсітэта. Другі год запар наш універсітэт прызнаецца лепшым сярод універсітэтаў краіны і ВНУ рэспублік па пастаноўцы спартыўна-масавай работы. Па выніках круглагадовай спартакіяды ГДУ уручан пераходны Чырвоны сцяг ЦС СДСТ «Буравеснік».

Ва ўсіх нашых поспехах адчуваюцца пастаянныя клопаты Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. І мы сёння запэўняем Радзіму, Ленінскі Цэнтральны Камітэт КПСС, што і ў далейшым будзем паспяхова выконваць задачы, якія стаяць перад вышэйшай школай і навукай.

Рэктар універсітэта
акадэмік АН БССР прафесар **Ул. А. БЕЛЫ.**
Сакратар парткома **У. В. КАЗЛОЎ**
Старшыня мясцкома **Ф. Ф. ГАНЧЭЛЬ**
Сакратар камітэта камсамола **Т. І. ІЛЬЯНКОВА**
Старшыня прафкома **М. Л. БАЙДА**

## У МЯСЦОВЫМ КАМІТЭЦЕ

31 кастрычніка адбылося арганізацыйнае пасяджэнне мясцовага камітэта універсітэта. На ім былі абраны старшыня мясцкома, яго намеснікі і старшыні камісій.

Старшынёй мясцкома абран дацэнт Фелікс Феліксавіч Ганчэль, а намеснікамі — доктар медыцынскіх навук Аляксей Савельевіч Калугін і старшы выкладчык Іван Мікалаевіч Палій. Ніна Іванаўна Папкова абрана казначэем, а Маргарыта Уладзіміраўна Епіхпва — сакратаром мясцкома.

Абавязкі паміж членамі мясцкома размеркаваліся наступным чынам:

Вытворча - масавая камісія — старшыня А. С. Калугін, члены камісіі — М. В. Гусева і М. Ф. Рудзінская.

Жыллёва-бытавая камісія— старшыня І. М. Палій, члены камісіі — В. Е. Верамейчык, Л. А. Дзяменцьева, Е. Р. Жыўтабрух.

Культурна - масавая камісія — старшыня В. І. Філічава, члены камісіі — Н. І. Перхунова, Ж. В. Манько, А. В. Архіпаў, А. К. Няронская.

Камісія па ахове працы і тэхніцы бяспекі — старшыня Ю. Ф. Хадакоўскі, член камісіі — В. І. Недасек.

Рэвізійная камісія — старшыня А. А. Баскакаў, члены камісіі — Т. П. Іоскіна, І. К.

